# ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Камянчук Валерыя Вадзімаўна
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна"

Чытанне ў жыцці кожнага культурнага чалавека займае важнае месца. Вучань, як будучы чытач, ва ўмовах панавання інфармацыйных тэхналогій не павінен страціць цікавасць да чытання кніг, здольных узбагаціць унутраны свет чалавека, даць веды аб жыцці і навакольным свеце, развіць самастойнасць мыслення і даставіць чытычу мастацкую асалоду. Добрая кніга – гэта і выхавальнік, і настаўнік, і сябар. Прыгадваючы словы В. А. Сухамлінскага аб тым, што можна жыць і быць шчаслівым, не авалодаўшы матэматыкай. Але нельга быць шчаслівым, не ўмеючы чытаць. Навыкі ж чытання закладваюцца ў пачатковай школе, на іх фарміраванне і ўдасканаленне і накіравана дысцыпліна «Літаратурнае чытанне».

Прадмет «Літаратурнае чытанне» ўведзены ў вучэбныя планы пачатковай школы ў пачатку XX стагоддзя, што стала істотным крокам у пачатковай адукацыі. Да гэтага літаратуры не надавалася такой увагі, не быў вылучаны і яе выхаваўчы патэнцыял. Сёння літаратурнае чытанне ў пачатковай школе – першае звяно ў сістэме адзінай бесперапыннай літаратурнай адукацыі і культуралагічнай падрыхтоўкі школьнікаў, якое прадугледжвае авалоданне той культурай, тым сацыяльным вопытам, які выпрацавала чалавецтва з дапамогай чытання і аналізу лепшых узораў літаратурных твораў, сабраных у адзіны навучальны дапаможнік і размеркаваных па класах. Пры дапамозе літаратуры вучні не толькі авалодваюць навыкам чытання, але і спасцігаюць культурны вопыт маральных, этычных адносін паміж людзьмі, вопыт эстэтычнага ўспрымання навакольнай рэчаіснасці.

Перад настаўнікам стаіць важная задача – выкарыстаць увесь выхаваўчы патэнцыял літаратуры, каб уздзейнічаць на асобу вучня, сфарміраваць такія якасці, як адказнасць, дабрыня, справядлівасць і інш. Асабліва важна па магчымасці выкарыстоўваць выхаваўчыя магчымасці літаратуры ў пачатковай школе (1-4 класы), бо менавіта ў малодшым школьным узросце вучні найбольш эмацыйна адгукаюцца на праблемы, якія закранаюцца ў творах, суперажываюць героям, асуджаюць ці радуюцца за іх, захапляюцца апісаннем прыроды ў творах і інш. Такім чынам адбываецца непрыкметнае для саміх вучняў прывіццё маральных і эстэтычных якасцей, такіх, як прыязнасць, ветлівасць, культура паводзін, эстэтычны густ і г.д. Гэта звязана з тым, што літаратура, як мастацтва слова, у пачатковай школе выконвае асаблівыя функцыі. М. П. Ваюшына

вылучае пяць асноўных функцый літаратуры: эстэтычную, выхаваўчую, аксіялагічную, пазнавальную, геданістычную.

Эстэтычная функцыя мае асаблівае значэнне, паколькі і пазнанне, і выхаванне, і фарміраванне перакананняў, і развіццё пачуццяў літаратура ажыццяўляе толькі ёй уласцівымі спосабамі і сродкамі і па-за эстэтычным успрыманні функцыянальная накіраванасць літаратуры як мастацтва не рэалізуецца. Эстэтыка ацэньвае свет не па законах карысці, а па законах прыгажосці, і таму эстэтычная ацэнка – ацэнка, суаднесеная з агульначалавечымі каштоўнасцямі. Эстэтычнае ўздзеянне – адно з каарэнных іманентных сутнасных уласцівасцяў літаратуры і мастацтва, якое абуджае творчы дух, творчы пачатак асобы, жаданне і ўменне тварыць па законах прыгажосці і фарміруе каштоўнасныя арыенціры асобы, яе мастацкія густы, здольнасці і патрэбы. Напрыклад, у падручніках для другога і чацвёртага класаў па літаратурным чытанні тэме восені прысвечаны асобныя раздзелы. У другім класе – гэта раздзел «Мы не заўважылі і самі, як восень па зямлі пайшла», у чацвёртым – «На ніцях белай павуціны прывозяць восень павучкі». У іх змешчаны творы вядомых беларускіх паэтаў і празаікаў, якія прысвечаны восені. Напрыклад, верш «Верасень» Міколы Хведаровіча, у якім апісваецца паступовы надыход восені: «Звіняць пажоўклыя лясы, і пахне спелым верасам…». У вершы апісваецца стан прыроды ў момант надыходу восені і з’яўляецца выдатным сродкам выхавання вучняў пачатковых класаў.

Аксіялагічная (ацэначная) і выхаваўчая функцыі літаратуры цесна звязаны. Малюючы жыццё, узнаўляючы жыццёвыя сітуацыі, апісваючы ўчынкі, перажыванні, разважанні персанажаў, пісьменнік адначасова ацэньвае іх, так як кожнае слова ў тэксце прасякнута аўтарскім пачуццём, аўтарскім бачаннем свету. У творы складваецца цэлая сістэма мастацкіх сцверджанняў і адмаўленняў, ацэнак; кожны твор нясе ў сабе і імкнецца сцвердзіць у свядомасці і ўспрыманні пэўную сістэму каштоўнасцяў, пэўны тып эмацыйна-каштоўнаснай арыентацыі. Выхаваўчая функцыя літаратуры не азначае лагічнага засваення, прыняцця нейкай сістэмы каштоўнасцяў, «канфіскаванай» з твора ў выглядзе высноў; выхаванне адбываецца ў выніку далучэння чытача да духоўнага вопыту, што набываецца ў працэсе зносін з тэкстам мастацкага твора, а не ў выніку высноў, зробленых з прачытанага пад кіраўніцтвам настаўніка. Так адбываецца ў працэсе чытання апавядання «Памяць» Ванды Асухоўска-Арлоўскай; гэты твор змяшчае ў сабе глыбокі сэнс і не павінен пакінуць абыякавым ніводнага вучня. А асноўная ідэя твора – «… памятаць толькі добрае, што было між намі», і тое, што прызнаўся ўнук бабулі, што з’еў бананы, дазволяць выхаваць спагадлівасць, чуласць, павагу ў школьнікаў.

Пазнавальная функцыя літаратуры не зводзіцца да ўспрымання фактычнай інфармацыі з тэксту. Літаратура спазнае тое, што не даступна

навуцы, паколькі спазнае свет інакш. Навуковае пазнанне раздзяляе і аналізуе рэчаіснасць, вылучаючы істотныя прыкметы, абстрагуючыся ад індывідуальнага, аперуе паняццямі, якім уласціва адназначнасць. Літаратура як мастацтва ідзе шляхам стварэння другой – мастацкай – рэчаіснасці. Пры гэтым узнаўляецца жыццё цэласна ў канкрэтна-пачуццёвых формах, вобразах. Толькі эстэтычнае засваенне мастацкага тэксту прыводзіць да рэалізацыі і пазнавальнай, і выхаваўчай, і ідэалагічнай, і геданістычнай функцый літаратуры. Геданістычная функцыя мастацтва – функцыя эстэтычнай асалоды прыгажосцю, духоўнай радасці ад атрымання гармоніі, мастацкага пераадолення супярэчнасцей быцця – асабліва важная для пачатковай літатурнай адукацыі. Так як урок літаратурнага чытання закліканы дарыць вучню сустрэчу з выдатным, даваць вопыт эстэтычных перажыванняў, эмацыйных прасвятленняў, вопыт асалоды ад духоўных зносін з літаратурай як відам мастацтва. Аднак, асалода, якую атрымае вучань ад зносін з мастацтвам залежыць шмат у чым ад таго, як адбываюцца зносіны чытача і пісьменніка, у якой ступені запатрабаваны чытачом духоўны патэнцыял мастацкага твора. Для гэтага важна, каб твор адпавядаў узросту і інтарэсам навучэнцаў, закранаў актуальныя для іх тэмы. Толькі тады ад сустрэчы з літаратурным творам вучань можа атрымаць асалоду і радасць і, такім чынам, зробіць кнігу сваім сталым спадарожнікам і мудрым дарадцам па жыцці.

Такім чынам, курс літаратурнага чытання можна разглядаць як прадмет, які забяспечвае вырашэнне не толькі функцыянальных задач навучання і культаралагічнай падрыхтоўкі, але і больш шырокую адукацыю малодшых школьнікаў: выхаванне цікавасці да чытання і мастацкай літаратуры; развіццё культуры ўспрымання мастацкага тэксту; фарміраванне ўмення арыентавацца ў асобных літаратурных паняццях, пашырэнне кругагляду, маральна-этычнае і эстэтычнае выхаванне сродкамі мастацкага слова.